**АБАРОНА** АД СТРАХУ
**АБАРОНА АД ГВАЛТУ**

COUNCIL OF EUROPE
CONSEIL DE L'EUROPE

# 12 крокаў да выканання Канвенцыі Рады Еўропы аб прадухіленні гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту і барацьбе з гэтымі з'явамі (Стамбульская канвенцыя)

1. **Асудзіць дыскрымінацыю жанчын** і прызнаць, што гвалт у адносінах да жанчын з'яўляецца парушэннем правоў чалавека і праявай гістарычна нераўнапраўных адносін паміж жанчынамі і мужчынамі.
2. **Інвеставаць у прэвентыўныя меры** шляхам змены поглядаў, гендарных роляў і стэрэатыпаў праз адукацыю, навучанне і рост усведамлення, пашырэння правоў і магчымасцей жанчын, заангажавання мужчын і хлопчыкаў і стварэння новых партнёрскіх адносін са сродкамі масавай інфармацыі і прыватным сектарам.
3. **Аблегчыць ахвярам доступ да атрымання падтрымкі** праз стварэнне бясплатнай нацыянальнай гарачай лініі і прытулкаў, арганізацыю медычнай, псіхалагічнай і юрыдычнай кансультацыі, дапамогу ў жыллёвых і фінансавых пытаннях і ў працаўладкаванні.
4. **Абараняць ахвяр, якія знаходзяцца ў групе рызыкі**, з дапамогай экстраных забаронных, абмежавальных і ахоўных судовых загадаў, ацэнкі рызыкі і кіравання рызыкамі.
5. **Змяніць закон** такім чынам, каб ён уключаў канкрэтныя крымінальныя артыкулы за псіхалагічны гвалт, пераследаванне, фізічны гвалт, сексуальны гвалт уключна са згвалтаваннем, прымусовы шлюб, калечанне жаночых палавых органаў, прымусовы аборт і прымусовую стэрылізацыю, і каб ён забараняў сексуальныя дамаганні.
6. **Павысіць эфектыўнасць** паліцыі, пракуратуры і суда ў разглядзе такіх спраў.
7. **Пашырэнне правоў і магчымасцей ахвяр у судовых працэсах** шляхам забеспячэння іх падтрымкі і абароны на працягу ўсяго працэсу, інфармавання іх пра агульны ход справы і пра іх роль у ёй і даючы ахвярам магчымасць быць выслуханымі і прадстаўляць доказы без неабходнасці сустракацца са злачынцам.
8. **Распрацаваць комплексную палітыку для ўсіх урадавых структур**, каб аб'яднаць намаганні прафесіяналаў для лепшай абароны і дапамогі ахвярам, прадухіліць далейшы гвалт і спыніць беспакаранасць за гвалтоўныя дзеянні ў дачыненні да жанчын або хатні гвалт.
9. **Прызнаць гендарны гвалт формай пераследу** пры вызначэнні статусу ўцекача для жанчынаў, якія шукаюць прытулку, і паважаць прынцып нявысылкі.
10. **Рэагаваць на асаблівыя патрэбы дзяцей** як ахвяр або сведак хатняга гвалту пры здзяйсненні ўсіх мер абароны і падтрымкі.
11. **Прызнаць і падтрымліваць ролю няўрадавых арганізацый і грамадзянскай супольнасці** ў барацьбе з гвалтам у адносінах да жанчын і хатнім гвалтам шляхам выдзялення адпаведных фінансавых і людскіх рэсурсаў і наладжвання эфектыўнага супрацоўніцтва з гэтымі арганізацыямі.
12. **Збор нацыянальных статыстычных дадзеных і падтрымка даследаванняў** для пашырэння базы ведаў аб гвалце ў адносінах да жанчын і хатнім гвалце.

**Для атрымання дадатковай інфармацыі, калі ласка, наведайце: www.coe.int/conventionviolence або звярніцеся па адрасе: conventionviolence@coe.int**

PREMS 132123